# Заканадаўчае забеспячэнне перспектыўнага развіцця краіны

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адбыліся першыя сесіі мясцовых Саветаў дэпутатаў, падчас якіх выбраны старшыні Саветаў і іх намеснікі, сфарміраваны прэзідыумы і пастаянныя камісіі. У склад цяперашняга дэпутацкага корпуса ўвайшлі дастойныя, актыўныя і неабыякавыя людзі, якія ведаюць чаканні сваіх выбаршчыкаў, здольныя эфектыўна і з улікам сучасных патрабаванняў арганізаваць работу органаў мясцовай улады, а галоўнае — яны ўмеюць працаваць з людзьмі. Гэта рэальны кадравы рэзерв нашай дзяржавы.

У новых рэаліях неабходна павышаць як ролю мясцовых Саветаў дэпутатаў, так і іх адказнасць за ажыццяўленне тых правоў і абавязкаў, якімі яны зараз надзелены. Аб'яднанню патэнцыялу мясцовых Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў і скаардынаванасці іх намаганняў на павышэнні якасці і выніковасці працы павінна спрыяць дзейнасць Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі. Мяркую, што мы ў найбліжэйшы час правядзём для старшыняў абласных, раённых і гарадскіх Саветаў дэпутатаў семінар-вучобу па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў і ўзмацнення ролі мясцовых Саветаў у вырашэнні праблем жыццезабеспячэння насельніцтва.

Прынятыя кіраўніком дзяржавы рашэнні па сацыяльна-эканамічным развіцці патрабуюць прынцыпова новых дзеянняў з боку Савета Рэспублікі па ўдасканаленні прававой базы, якая рэгулюе адносіны ў сферы дзелавой ініцыятывы, інвестыцыйнай дзейнасці, дзяржаўна-прыватнага партнёрства, павышэння жыццёвага ўзроўню людзей, іх сацыяльнай абароны і многіх іншых пытанняў.

У студзені гэтага года Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам зацверджаны план падрыхтоўкі законапраектаў на 2018 год, у адпаведнасці з якім планируецца распрацоўка 39 законапраектаў, а таксама дзвюх канцэпцый законапраектаў. Работа па рэалізацыі гэтага ўказа павінна прадугледжваць нарматыўнае прававое забеспячэнне практычнай рэалізацыі пяці асноўных прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, зацверджаных пятым Усебеларускім народным сходам: інвестыцыі, занятасць, экспарт, інфарматызацыя, маладзёжная палітыка.

Падчас вясновай сесіі нам трэба будзе разглядзець больш за 20 законапраектаў.

Заканатворчая дзейнасць на сучасным этапе патрабуе ўкаранення інавацыйных механізмаў падрыхтоўкі і прыняцця (выдання) нарматыўных прававых актаў. У першую чаргу — арганізацыі належнага прагназавання наступстваў прыняцця актаў заканадаўства, ацэнкі іх рэгулюючага ўздзеяння і навуковай экспертызы.

Адкрыццё сесіі Савета Рэспублікі супала з асаблівым святам — Днём яднання народаў Беларусі і Расіі.

Са святам Вас, паважаныя калегі!

Упэўнены, што палітычная воля, выкладзеная ў Дагаворы аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, будзе ў поўным аб'ёме рэалізавана на карысць нашых народаў і краін.

У красавіку 2018 года на пасяджэнні Міжпарламенцкай асамблеі СНД плануецца разглядзець вынікі дзейнасці асамблеі за мінулы год. Беларускай дэлегацыі лічу неабходным выступіць з прапановай аб узмацненні парламенцкага маніторынгу за збліжэннем заканадаўства дзяржаў — удзельніц СНД, у тым ліку праз імплементацыю мадэльных заканадаўчых актаў, што распрацоўваюцца асамблеяй, у нацыянальнае заканадаўства. За 25 гадоў МПА СНД распрацавала больш за 300 мадэльных актаў, якія закранаюць практычна ўсе сферы грамадскіх адносін. Варта прааналізаваць эфектыўнасць гэтай працы.

Важным кірункам нашай дзейнасці застаецца далейшае развіццё міжпарламенцкага супрацоўніцтва ў двухбаковым фармаце і на шматбаковых пляцоўках. У лютым гэтага года пад кіраўніцтвам намесніка старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця М. А. Шчоткінай і пры актыўным удзеле парламенцкай групы па МУР у Мінску па ініцыятыве Беларусі адбыўся першы Рэгіянальны форум каардынатараў па дасягненні МУР, у якім узялі ўдзел прадстаўнікі 40 краін і шэрагу міжнародных арганізацый. Мерапрыемства дазволіла выпрацаваць канкрэтныя рашэнні па арганізацыі дзейнасці па дасягненні МУР. Ініцыятыўная дзейнасць па гэтым кірунку будзе прадоўжана Саветам Рэспублікі і на іншых міжнародных пляцоўках.

2018 год аб'яўлены кіраўніком дзяржавы Годам малой радзімы. Рэгіянальнае развіццё мае прынцыповае значэнне для эфектыўнага сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы.

Наша, Савета Рэспублікі, задача — мабілізаваць сілы на тое, каб кожны населены пункт быў добраўпарадкаваны і людзі жылі на годным узроўні.

Не менш адказнае для нас разам з урадам і абласцямі пытанне — развіццё прамыслова-тэрытарыяльных кластараў. Актыўна ідзе праца па Оршы, Брэсцкі аблвыканкам прыняў рашэнні па горадзе Баранавічы і Баранавіцкім раёне. Будуць і іншыя праекты. Мяркую, што гэта будуць рэальныя пункты росту новай эканомікі.

Хачу пажадаць усім нам плённай і паспяховай работы.

# Галоўны арыенцір — новыя крыніцы ўстойлівага росту

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дэпутатам трэба актыўна падключацца да падрыхтоўкі рэспубліканскага бюджэту. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў, каб гэта работа праводзілася па-новаму. Кожны атрымальнік дзяржаўных сродкаў павінен дакладна абгрунтаваць неабходнасць іх выдзялення. Эканомія дзяржаўных сродкаў, іх эфектыўнае выкарыстанне — адзін з галоўных крытэрыяў ацэнкі дзейнасці дзяржаўных органаў. Пры гэтым важна захаваць сацыяльную накіраванасць бюджэту, тую падтрымку, якую дзяржава аказвае шматдзетным сем'ям, пенсіянерам і іншым сацыяльна слабаабароненым катэгорыям насельніцтва.

Трэба зрабіць больш простай, зразумелай і дружалюбнай для суб'ектаў гаспадарання падатковую сістэму. Яна павінна стымуляваць вытворчую працу грамадзян, іх занятасць, забяспечыць прырост паступленняў у бюджэт за кошт вываду сродкаў з шэрай эканомікі і легалізацыі бізнесу. У гэтым ключы свае прапановы павінны рыхтаваць і парламентарыі.

Другая найважнейшая задача сесіі — забяспечыць своечасовае прыняцце законапраектаў, накіраваных на паляпшэнне ўмоў гаспадарання.

У развіцці спрыяльнага бізнес-асяроддзя вялікая роля адводзіцца ўдасканаленню механізмаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Паспяховая рэалізацыя значных інфраструктурных праектаў з дапамогай тэхналогій, капіталу і рэсурсаў прыватнага бізнесу патрабуе спрашчэння правіл правядзення конкурсаў, скарачэння тэрмінаў заключэння пагадненняў, узмацнення гарантый уласнікаў.

Павышэнню інвестыцыйнай прывабнасці беларускай эканомікі паслужыць разгляд праекта закона аб гаспадарчых таварыствах, які паступіць да нас у найбліжэйшы час. Працаваць з ім трэба ў цеснай увязцы з дэпутацкімі ініцыятывамі па пытаннях інвестыцый і прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці. Мы дамовіліся, што ў рамках падрыхтоўкі гэтых дакументаў будуць праведзены парламенцкія слуханні. Іх вынікі павінны садзейнічаць прыняццю якасных, доўгатэрміновых заканадаўчых рашэнняў.

Тэма інвестыцый цесна пераклікаецца з задачамі, якія плануецца вырашыць у новай рэдакцыі закона аб дзяржаўных закупках. Прыняцце законапраекта дасць магчымасць зрабіць гэты працэс больш празрыстым і канкурэнтным, мінімізаваць карупцыйныя рызыкі і, што асабліва важна, рацыяналізаваць дзяржаўныя расходы. Штогод на закупку тавараў і паслуг з бюджэту накіроўваецца каля 10 працэнтаў ВУП. Таму законапраект вельмі запатрабаваны і павінен быць прыняты своечасова.

На сесіі будзе прадоўжана работа па развіцці канкрэтных галін эканомікі. Змяненні закрануць пытанні банкаўскай сістэмы і энергетычнай галіны. Папраўкі ў Паветраны кодэкс нацэлены на развіццё эксперыментальнай авіяцыі. Лібералізацыя заканадаўства аб транспартна-экспедыцыйнай дзейнасці і аўтамабільных дарогах будзе садзейнічаць развіццю прадпрымальніцтва ў гэтых сферах і стымуляваць занятасць.

Змяненні эканамічных адносін патрабуюць адпаведнай карэкціроўкі працоўнага заканадаўства. У ходзе сесіі нам трэба будзе разглядзець папраўкі ў Працоўны кодэкс, якія ў тым ліку ўрэгулююць працоўныя адносіны і сацыяльныя гарантыі дыстанцыйных работнікаў, колькасць якіх павялічваецца ў сувязі з развіццём інфармацыйных тэхналогій.

Сучасная эканоміка — гэта эканоміка ведаў. Таму самую пільную ўвагу трэба ўдзяляць сістэме адукацыі. Яна павінна не проста ісці ў нагу з часам, а працаваць на апярэджанне, фарміраваць такія якасці, як крэатыўнасць, гатоўнасць да авалодання новымі ведамі, мабільнасць. Гэта тое, што дазваляе сучаснаму чалавеку паспяхова канкурыраваць на рынку працы. Пры гэтым неабходна выхаваць сапраўднага грамадзяніна і патрыёта сваёй краіны. Усе гэтыя пытанні абмяркоўваюцца пры распрацоўцы праекта новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі, які павінен быць унесены ў ходзе сесіі. Улічваючы высокую сацыяльную значнасць гэтага дакумента, работу над ім у Палацы прадстаўнікоў трэба праводзіць максімальна адкрыта.

Увагу грамадства прыцягнуць і іншыя законапраекты, прызначаныя палепшыць жыццё нашых грамадзян. Новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса, праекты па пытаннях пітнога водазабеспячэння, абароны правоў спажыўцоў, якасці харчовай сыравіны і прадуктаў харчавання закранаюць непасрэдна інтарэсы кожнага чалавека. Новым і вельмі актуальным для нашай краіны дакументам з'яўляецца праект закона «Аб вытворчасці і абарачэнні арганічнай прадукцыі».

Пашырэнню нацыянальных інтарэсаў за мяжой будзе садзейнічаць ратыфікацыя шэрагу міжнародных пагадненняў. Сумесна з урадам і бізнес-супольнасцю дэпутатам трэба дабівацца, каб дасягнутыя дамоўленасці атрымлівалі далейшае развіццё.

Нарошчванне эканамічнага супрацоўніцтва ляжыць у аснове міжнароднай дзейнасці дэпутацкага корпуса. Пасля правядзення ў Мінску сесій парламенцкіх структур АБСЕ і Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы ў нас з'яўляюцца сур'ёзныя магчымасці для пашырэння ўзаемавыгадных кантактаў на еўрапейскім вектары.

Пацвярджэннем гэтага з'яўляецца першы ў гісторыі двухбаковых адносін візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Швейцарыю. Парадак дня перагавораў ахопліваў самае шырокае кола пытанняў узаемадзеяння ў гандлёва-эканамічнай, крэдытна-інвестыцыйнай і гуманітарнай галінах. І мы ўпэўнены, што Мемарандум аб узаемаразуменні паміж парламенцкімі групамі дружбы, падпісаны ў ходзе візіту, будзе пакладзены ў аснову рэалізацыі намечаных планаў.

Атрымліваюць новае напаўненне нашы адносіны з міжпарламенцкімі арганізацыямі. У пачатку года мы прымалі спецыяльнага прадстаўніка ПА АБСЕ па Усходняй Еўропе Кента Харстэда, кіраўніка швейцарскай дэлегацыі ў ПА АБСЕ, старшыню Камітэта па знешняй палітыцы Савета кантонаў Федэральнага сходу Швейцарыі Філіпа Ламбардзі. Акрамя абмеркавання палітычных пытанняў, мы закранаалі аспекты эканамічнага супрацоўніцтва, інвестыцый, развіцця адносін у гуманітарнай сферы.

Абмеркаванне гэтых тэм працягвалася і на палях зімняй сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Вене, а таксама ў Азербайджане на міжнароднай канферэнцыі, праведзенай Групай падтрымкі Шаўковага шляху ў рамках ПА АБСЕ. Беларускія парламентарыі выступілі сузаснавальнікамі гэтай Групы, у якую ўваходзяць прадстаўнікі 22 дзяржаў, у тым ліку Аўстрыі, Іспаніі, Польшчы, Турцыі, Швейцарыі.

Пашыраецца ўзаемадзеянне беларускіх дэпутатаў з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы. З гэтага года мы на рэгулярнай аснове прымаем удзел у пасяджэннях Камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях і дэмакратыі. Гэта, несумненна, садзейнічае ўмацаванню ўзаемаразумення, давядзенню да нашых партнёраў аб'ектыўнай інфармацыі аб змяненнях, якія адбываюцца ў краіне і грамадстве, дае магчымасць весці адкрыты раўнапраўны дыялог.

Безумоўна, у нас яшчэ ёсць шэраг тэм, што ўяўляюць узаемную цікавасць, якія не могуць быць вырашаны ў адзін момант, а патрабуюць асэнсаванага паступовага руху наперад. І мы гатовы да супрацоўніцтва ў гэтай сферы.

Актыўны ўдзел беларускія парламентарыі прынялі ў рабоце іншых аўтарытэтных міжпарламенцкіх арганізацый. Пытанні ўмацавання міру, прыцягнення прыватнага сектара да ажыццяўлення Мэт устойлівага развіцця, забеспячэння гендарнай роўнасці былі прадметам дыскусій на 138-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза, якая адбылася ў канцы сакавіка ў Жэневе. Па лініі міжпарламенцкіх структур Саюзнай дзяржавы, СНД і АДКБ беларускія дэпутаты ўдзельнічалі ў міжнародным назіранні за выбарамі Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, парламенцкімі выбарамі ў Туркменістане.

Паспяхова развіваюцца і нашы двухбаковыя сувязі. У пачатку года Беларусь наведала парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Карэя. Літаральна гэтымі днямі вялікая група беларускіх парламентарыяў вярнулася з Кітая, дзе абмяркоўвалася роля парламентаў дзвюх краін у пашырэнні палітычнага і эканамічнага супрацоўніцтва.

Умацаванню партнёрскіх адносін садзейнічалі нашы сустрэчы з прэм'ер-міністрамі Латвіі і Турцыі, намеснікам міністра замежных спраў Украіны, дэлегацыяй краю Высачына Чэшскай Рэспублікі, прадстаўнікамі дыпламатычнага корпуса.

У міжсесійны перыяд не спыняліся кантакты з нашым стратэгічным партнёрам — Расіяй. У цэнтры ўвагі беларускіх і расійскіх парламентарыяў былі пытанні бюджэтнай палітыкі, развіцця рэгіянальнага супрацоўніцтва, удасканалення парадку распрацоўкі і рэалізацыі саюзных праграм, збліжэння заканадаўства ў галіне нацыянальнай бяспекі, захавання аб'ектаў агульнай культурнай спадчыны.

Гэтыя напрацоўкі будуць пакладзены ў аснову пытанняў, якія плануецца разгледзець на пяцьдзясят чацвёртай сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, якая ў чэрвені гэтага года пройдзе ў Брэсце. Неабходна сур'ёзна падысці да яе правядзення, выносячы на абмеркаванне праблемы, якія хвалююць людзей, суб'ектаў гаспадарання, непасрэдна закранаюць іх інтарэсы.

У найбліжэйшы час наша дэлегацыя накіруецца ў Санкт-Пецярбург для ўдзелу ў сорак сёмым пленарным пасяджэнні Міжпарламенцкай асамблеі СНД, а таксама ў пасяджэннях саветаў МПА СНД і ПА АДКБ. Тут таксама трэба займаць больш прынцыповую пазіцыю па павышэнні эфектыўнасці дзейнасці гэтых арганізацый у рэчышчы ўстановак кіраўніка дзяржавы.

Традыцыйна ў ходзе вясенняй сесіі асаблівую ўвагу плануецца ўдзяліць візітам замежных парламенцкіх дэлегацый. У прыватнасці, мы прапрацоўваем магчымасць прыняць у Рэспубліцы Беларусь парламенцкія дэлегацыі Арменіі, Індыі, Латвіі і Малдовы. Беларускія парламентарыі, у сваю чаргу, правядуць кансультацыі па паглыбленні супрацоўніцтва з шэрагам замежных дзяржаў.

Паважаныя калегі!

Бягучы год аб'яўлены ў Беларусі Годам малой радзімы, што асабліва актуальна ў святле задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы па развіцці рэгіёнаў і вызначэнні перспектыўных пунктаў росту эканомікі. У акругах сканцэнтраваны вялікі патэнцыял, і трэба правільна яго выкарыстаць. У нас шмат неабыякавых людзей, энтузіястаў, якія жадаюць абнавіць сваю малую радзіму. Трэба дапамагчы ім у іх высакародным імкненні, асабліва калі размова ідзе аб моладзі. Ёсць у нас і прадпрымальнікі, здольныя падтрымаць грамадскую ініцыятыву па навядзенні парадку на зямлі і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. Гэтыя пытанні трэба ўлічваць і пры планаванні нашай міжнароднай дзейнасці, паколькі сярод прадстаўнікоў беларускай дыяспары нямала вядомых і ўплывовых людзей.

Сэнс усёй гэтай маштабнай работы ў тым, каб усе мы, незалежна ад узросту, прафесіі, дастатку або месца жыхарства, адчулі сябе звязанымі з лёсам сваёй Радзімы. Паколькі менавіта грамадская салідарнасць і народнае адзінства — гэта найважнейшая ўмова ўстойлівага развіцця любой краіны.

На заканчэнне, паважаныя ўдзельнікі пасяджэння, карыстаючыся магчымасцю, хачу павіншаваць усіх нас і нашых расійскіх калег са святам — Днём яднання народаў Беларусі і Расіі, пажадаць усім шчасця, здароўя і поспехаў у дзейнасці на карысць нашых народаў.